# СУЧАСНЫ ВОПЫТ ВЫВУЧЭННЯ ЭТНАКУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ У АГУЛЬНААДУКАЦЫЙНЫХ ШКОЛАХ

**Д. С. Пратасевіч**

Этнакультурныя нацыі – гэта стварэнне, назапашванне і трансляцыя з пакалення ў пакаленне бытавых і культурных асаблівасцей народа, яго поглядаў, ідэалаў, які ствараецца яго індывідамі і існуючай ў побыце людзей паэзіі (эпаса, паданняў, легенд, казак), тэатральнага і музычнага фальклора побытавых танццаў, дойлідства, ужытковага мастацтва. Да этнакультуры звычайна адносяць:

- Традыцыйную рэлігію (язычніцтва);
- Рытуалы і святы землробчага календара;
- Сямейныя абрады;
- Нацыянальну кухню;
- Нацыянальны касцюм;
- Музычныя інструменты;
- Нацыянальны этыкет;
- Звычаі;
- Грамадскія рытуалы;
- Традыцыйныя працоўныя заняткі, рамествы.

У 1993 годзе дацэнт Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў І.І.Сучкоў прапанаваў увесці ў агульнаадукацыйных школах інтэграваны прадмет «Этнакультура беларусаў». Першай яго ініцыятыву падтрымала школа ў Сеніцы. Першай мінскай школай з паглыбленым вывучэннем прадметаў тэнамастацкага цыклу стала СШ № 89. Затым пляцоўка «Этнашкола» была адчынена ў Міханавічах, Наваполацке, Вілейцы, в.Дземідавічы, в.Палачынцы, Навагрудку, Любані, СШ № 3 г. Мінска.

У склад інтэграванага прадмета «Этнакультура беларусаў» уваходзяць наступныя прадметы паглыбленага вывучэння этнамастацкага цыклу:

- Тэатральны фальклор (у базавай школе – фальклорны тэатр);
- Мастацтва вуснага слова (вусны фальклор);
- Харэаграфічны фальклор;
- Музычны фальклор;
- Песенны фальклор;
- Акрабатыка (фізічная культура);
- Мастацкая праца (ужытковае мастацтва).

Эксперыментальныя праграмы прадметаў паглыбленага вывучэння ўмоўна падзелены на тры часткі. У першую ўваходзяць праграмы прадметаў

паглыбленага вывучэння для вучняў першага класа. У другую частку – для вучняў пачатковай школы (2-я – 4-я класы). Трэцюю частку складаюць праграмы прадметаў для вучняў базавай школы (5-я – 9-я класы).

Дзеля заняткаў па прадметах паглыбленага навучання клас дзеліцца на 2 групы. На групавых, дробнагрупавых занятках, у ансамблях, аркестрах і зводных занятках дзеці вучацца тэартральнаму дзеянню і ігры на фальклорным музычным інструменце, побыткавым танцам і спевам сваей мясцовасці, ужытковаму мастацтву: вышыўцы, вязанню, выцінанцы, разьбе і размалеўцы па дрэве, ганчарству, ткацтву,пляценню з саломы, лазы і г.д.

Вопыт паказвае, што адукацыя сродкамі этнакультуры садзейнічае выхаванню творча актыўнай асобы, дапамагае перадаць нашчадкам велізарны міфалагічны, філасофскі, мастацкі, маральны, эстэтычны вопыт, які назапашылі беларусы.

Заняткі па прадметах паглыбленага вывучэння этнамастацкага цыклу накіраваны адначасова ў два напрамкі:

- Развіць ва ўсіх дзецях попыт да мастацка-творчай работы і даць ім трываля навыкі ўласнай мастацкай дзейнасці;
- Развіць у вучняў цікавасць да фальклору і на гэтай аснове навучыць правільна, эмацыянальна глыбока ўспрымаць творы мастацтва, яго розныя формы і напрамкі.

Галоўнымі задачамі выкладання ўсіх прадметаў паглыбленага вывучэння з'уляюцца:

- Выхаванне актыўных адносін да жыцця і з'яў мастацкай культуры, да фальклору і ўжытковага мастацтва;
- Ужыўлення вучня ў кантэкст беларускай этнакультуры;
- Сістэматычнае развіцце мастацка-творчых здольнасцей усіх без выключэння вучняў, фарміраванне ў дзяцей практычных навыкаў работы ў разных відах і жанрах фальклорна-аўтэнтычнай дзейнасці;
- Далейшае развіцце ўжытковага мастацтва сваей іясцовасці, аднаўленне, рэстаўрацыя і рэканструкцыя аўтэнтычных формаў фальклору;
- Выхаванне дакладных уяўленняў аб нацыянальнай сваеасаблівасці роднай культуры, свят і абрадаў земляробчага календара, мастацкіх традыцый аўтэнтычнага фальклору ўжытковага мастацтва;
- Збіранне, вывучэнне і захаванне мясцовага фальклору;
- Фарміраванне здольнасцей выкарыстоўваць мастацкія навыкі і веды ў жыцці і практычнай дзейнасці незалежна ад прафесіі.

Асобныя заняткі па ўсіх прадметах паглыбленага вывучэння этнакультурнала цыклу аб'ядноўваюцца вакол апроных практыкаванняў для вырашэння адзіных вучэбна-выхаваўчых і творчых задач. Ядром

апорных практыкаванняў «Этнашколы» з'яўляюцца сінкрэтычныя з'явы фальклору, якія ў першасным сінтэзе яднаюць усе (альбо амаль усе) яго жанры. Ланцужок апорных практыкаванняў складае адукацыйна-выхаваўчыя модулі. У кожным класе такіх модулей два:

1 – «Калыханка», «Лялькнік»

2 – «Каляды», «Камаедзіца»

3 – «Багач», «Грамніцы»

4 – «Масленіца», «Абрад ініцыяцый (выпускны баль)»;

5 – «Жаніцьба коміна», «Семуха»

6 – «Дзяды», «Юр'я»

7 – «Дамавік», «Купалле»;

8 – «Жаніцьба Цярэшкі», «Вяселле»;

9 – «Радзіны», «Абрад ініцыяцый (Выпускны баль)».

На працягу навучальнага года настаўнік прадметаў паглыбленага вывучэння прадметаў этнамастацкага цыкла павінен праводзіць бягучую ацэнку ўменняў і ведаў вучняў. Ацэнка паспяховасці за чвэрць і год выстаўляецца на падставе адзнак за кожную практычную работу і за вучныя адказы вучняў. З улікам спецыфікі фальклору і ўжытковага мастацтва (як вучэбных прадметаў) і асобных адносін вучняў да фальклорна-мастацкай дзейнасці ацэнка бягусых работ павінна быць стымулюючай, яна павінна заахвочваць старанасць і захапленне школьнымі заняткамі. Адмоўная адзнака не дапускаецца.

Такім чынам, у разглядаемым вопыте зроблена спроба ўзнавіць святы, якія дапамагаюць больш зручным і цікавым спосабам пазнёміць школьнікаў з традыцыямі нашых продкаў.

## ИНФОРМАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ В ОБУЧЕНИИ

**Д. А. Рудь**

Применение современных информационных технологий в обучении – одна из наиболее важных и устойчивых тенденций развития мирового образовательного процесса. В отечественной общеобразовательной школе в последние годы компьютерная техника и другие средства информационных технологий стали всё чаще использоваться при изучении большинства учебных предметов.

Информация существенно повлияла на процесс приобретения знаний. Новые технологии обучения на основе информационных и коммуникационных позволяют интенсифицировать образовательный процесс, увеличить скорость восприятия, понимания и глубину усвоения огромных массивов знаний.